ISSN 1993-2030

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

"У дапамогу педагогу"
Серыя

*Сто тысяч год няхай вакол шумяць палі,*
*Сто тысяч год няхай вакол гудуць дубровы,*
*Пакуль гучыць вакол святая наша мова,*
*Пакуль жывуць беларусы на Зямлі.*

*Ул. Караткевіч*



9 (227)
верасень
2020

## ЗМЕСТ 9/2020

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

### Запрашаем на ўрок


3 *Войткус В. А.* Алена Масла. «Таямніца закінутай хаты» (план-канспект урока дадатковага чытання ў V класе)

6 *Несцяровіч С. У.* Рамантычная паэма Янкі Купалы «Курган» (тэставае заданне, VII клас)

9 *Навумчык М. І.* Аналіз апавядання Васіля Быкава «Незагойная рана» (VII клас)

11 *Лабачэўская С. У.* Тэкст. Прыметы тэксту (V клас)

14 *Грахольская С. А.* Галоўныя і даданыя члены сказа (V клас)

15 *Троцкая Т. А.* Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны (VI клас)

18 *Спірчонак В. В.* Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле «Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне» (IX клас)

22 *Смяян Т. Р.* Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле «Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне» (IX клас)


### Методыка і вопыт


25 *Зелянко С. В.* Запазычаная лексіка ў беларускай мове (дапаможны матэрыял для настаўніка)

29 *Якімовіч А. М.* Вывучаем беларускі правапіс: практыкум


### Настаўніцкі семінар


**Беларуская мова і літаратура: актуальныя пытанні навучання і выхавання: матэрыялы завочнага круглага стала**

33 *Мінкевіч Т. А.* Развіццё пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў на ўроках беларускай мовы праз праблемнае навучанне (з вопыту працы)

39 *Цялега А. П.* Сучасны ўрок: парная і групавая формы працы

41 *Раманоўская Р. М.* Безадзнакавая дзейнасць настаўніка і навучэнцаў на факультатыўных занятках (план-канспект майстар-класа)


### Навуковыя публікацыі


46 *Васюковіч Л. С.* Чытанне вучэбнага тэксту як метапрадметная дзейнасць


### Рыхтуемся да алімпіяды


54 Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры (матэрыялы для аналізу і падрыхтоўкі). *Матэрыялы падрыхтавалі В. Л. Вbelieveрановіч, В. І. Караткевіч, І. І. Караткевіч*


### Пазакласная работа


60 *Чаронка А. П.* «Беларусь мая, родны край...» (гадзіна паэзіі для вучняў V—VIII класаў)


### Займальны матэрыял


64 Францішак Багушэвіч: жыццё і творчасць: крыжаванка. *Склала Л. М. Балуева*


**На другой старонцы вокладкі** — партрэт Францішка Багушэвіча (1840—1900). *Мастак А. Ю. Грынькова.*
**На трэцяй старонцы вокладкі** — фотаздымак памятнага каменя ў гонар Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, беларускага паэта, драматурга, публіцыста і даследчыка фальклору, у аграгарадку Кублічы Ушацкага раёна. *Фота прадстаўлена Кубліцкім сельвыканкамам.*


Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, паведамленне для ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай версіі часопіса).



Рэдактары *А. У. Бельская, В. Д. Дзяруга.* Карэктар *А. У. Бельская.* Камп'ютарны набор *А. У. Бельскай, І. М. Кузьмянковай.* Макет і вёрстка *І. М. Кузьмянковай.*

Выхад у свет 29.09.2020. Фармат $60{\times}84^1/_8$. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 7,44. Ул.-выд. арк. 7,44. Тыраж 1206 экз. Заказ 106. Цана свабодная.

Адрас рэдакцыі часопіса «Беларуская мова і літаратура»: Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск, тэл.: 297-93-20.

Надрукавана ў таварыстве з абмежаванай адказнасцю «СУГАРТ». ЛП № 02330/427 ад 17.12.2012. Вул. Кнорына, д. 50, корп. 8, каб. 305, 220103, г. Мінск



© РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2020
© Вокладка. К. К. Шастоўскі, 2020

• актуалізацыі ведаў (пры выкананні вуснага задання);

• замацавання і паўтарэння (пры правядзенні самастойнай работы);

• адкрыцця новых ведаў (пры рэалізацыі праблемных сітуацый);

• падвядзенні вынікаў урока (пры падагульненні і фармулёўцы высноў).

Але групавая форма мае і шэраг недахопаў. Найбольш істотнымі з'яўляюцца:

• цяжкасці камплектавання груп і арганізацыі працы ў іх;

• навучэнцы ў групах не заўсёды ў стане самастойна разабрацца ў складаным навучальным матэрыяле і абраць самы эканомны шлях яго вывучэння. У выніку слабыя вучні з цяжкасцю засвойваюць матэрыял, а моцныя маюць патрэбу ў арыгінальных заданнях і задачах;

• асобныя дзеці адмоўчваюцца, губляюцца;

• аб'ектыўнасць ацэнкі за працу часам парушаецца.

Настаўніку трэба звярнуць увагу на тое, што пры камплектаванні груп важна ўлічваць характар міжасобасных зносін навучэнцаў. Псіхолаг Ю. М. Кулюткін у гэтай сувязі адзначае: «У групу павінны падбірацца навучэнцы, паміж якімі склаліся адносіны добразычлівасці. Толькі ў гэтым выпадку ўзнікае псіхалагічная атмасфера ўзаемаразумення і ўзаемадапамогі, здымаюцца трывожнасць і страх».

Толькі ў спалучэнні з іншымі формамі навучання вучняў на ўроку — франтальнай і індывідуальнай — групавая форма арганізацыі працы навучэнцаў прыносіць чаканыя станоўчыя вынікі.

### Спіс выкарыстанай літаратуры

*Панина, Т. С.* Современные способы активизации обучения / Т. С. Панина, Л. Н. Вавилова ; под ред. Т. С. Паниной. — М. : Изд. центр «Академия», 2006. — 176 с.

*Рыжкина, Е. Ю.* Применение технологии «Коллективный способ обучения» на уроках русского языка / Е. Ю. Рыжкина // Вестник научных конференций. — 2016. — № 10-5(14). — С. 160—162.

*Филатова, И. М.* Групповая работа — одна из форм деятельностного метода обучения / И. М. Филатова // Педагогическое пространство: обучение, развитие, управление талантами : сб. материалов Междунар. пед. форума; 21 июня 2016 г. / гл. ред. М. П. Нечаев. — Чебоксары : Экспертно-метод. центр, 2016. — С. 62—65.

**Р. М. РАМАНОЎСКАЯ,**
настаўніца вышэйшай катэгорыі Маладзечанскай сярэдняй школы № 1
імя Янкі Купалы, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь

# БЕЗАДЗНАКАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НАСТАЎНІКА І НАВУЧЭНЦАЎ НА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАХ

## (план-канспект майстар-класа)

Мэта: падвышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў у пытанні арганізацыі безадзнакавай дзейнасці на факультатыўных занятках.

Задачы: актуалізаваць веды ўдзельнікаў майстар-класа па пытанні арганізацыі безадзнакавай дзейнасці ў адукацыйным працэсе; прэзентаваць вопыт працы майстра па арганізацыі безадзнакавай дзейнасці на факультатыўных занятках па беларускай мове; садзейнічаць фарміраванню кампетэнцый удзельнікаў майстар-класа па распрацоўцы фрагментаў факультатыўных заняткаў з выкарыстаннем безадзнакавай дзейнасці.

## Ход майстар-класа

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

Мэта этапу: арганізацыя дзейнасці ўдзельнікаў майстар-класа і падрыхтоўка да ўзаемаадносін з майстрам.

Майстар. Паважаныя калегі! Запрашаю вас на каворкінг — аб'яднанне людзей для творчага ўзаемадзеяння. Спадзяюся на паспяховую працу.

Хацелася б пачаць з загадкі: «Яна доўжыцца хвіліну, а ў памяці застаецца назаўсёды». *(Усмешка.)*

Няхай усмешка паспрыяе атмасферы добразычлівасці ў дзелавых стасунках і ўздыме нам настрой, засцеражэ ад суму і непрыемнасцей. Усміхніцеся адзін аднаму, каб стварыць цудоўны настрой. Спадзяюся, сюды вы прыйшлі з ахвотай, бо ў вас ёсць жаданне навучыцца чамусьці новаму.

З дапамогай картак вызначым, наколькі актуальным з'яўляецца для вас пытанне арганізацыі ацэначнай дзейнасці на факультатыўных занятках. Калі актуальна — падыміце картку зялёнага колеру, часткова — жоўтага, а калі вы лічыце яго неактуальным, то падыміце картку чырвонага колеру. Згодна з карткамі, якія вы выбралі, мяркую, што гэта тэма з'яўляецца актуальнай.

**II. Тэарэтычны этап.**

*Мэта этапу:* знаёмства ўдзельнікаў майстар-класа з арганізацыяй безадзнакавай дзейнасці вучняў на факультатыўных занятках.

Працэс ацэньвання навучэнцамі ўласнай вучэбнай дзейнасці, сваіх адукацыйных прадуктаў мае несумненнае педагагічнае значэнне: па-першае, на занятках забяспечваецца зваротная сувязь, дзякуючы якой вучань бачыць дынаміку ў вывучэнні матэрыялу і можа скарэкціраваць уласную дзейнасць; па-другое, падвышаецца вучэбна-пазнавальная актыўнасць, што станоўча ўплывае на выніковасць адукацыйнага працэсу; па-трэцяе, вучань авалодвае навыкамі рэфлексіі — адной з ключавых кампетэнцый сучаснага чалавека. Але гэта на ўроку! А як жа суадносяцца ўрок і факультатыўныя заняткі? Чым яны падобныя і чым розняцца? *(Пытанні абмяркоўваюцца ў групах, удзельнікі майстар-класа выказваюць думкі.)*

І на ўроку, і на факультатыўных занятках дзеці здабываюць новыя веды пад кіраўніцтвам настаўніка. Факультатыў дапамагае сістэматызаваць, пашырыць і паглыбіць веды па прадмеце, паколькі дазваляе выйсці па-за межы вучэбнай праграмы. Тут спрацоўвае прынцып пераемнасці.

На ўроку вучань бачыць і ацэньвае ступень уласных ведаў, за працу ён атрымлівае адзнаку. На факультатыўных занятках адзнакі не ставяцца, бо факультатыўнае навучанне, як добра вядома настаўнікам, павінна быць безадзнакавым. Адукацыйны працэс без адзнак не з'яўляецца чымсьці прынцыпова новым. Без ацэньвання вучэбных дасягненняў у балах праводзяцца ўрокі ў першым і другім класах, заняткі ў групах, дадатковыя заняткі з вучнямі, якія рыхтуюцца да ўдзелу ў алімпіядзе ці ў цэнтралізаваным тэсціраванні. На такіх занятках вучні займаюцца не дзеля адзнак — ім цікавы сам працэс творчасці, пошуку, пазнання. Такая вучэбна-пазнаваўчая матывацыя і актыўнасць абумоўлены наступнымі прычынамі:

- асабістым выбарам гуртка ці дадатковых заняткаў;
- індывідуальнымі схільнасцямі і патрэбамі вучня;
- прафесійнымі якасцямі і харызмай настаўніка;
- значымасцю прапанаванага на занятках матэрыялу (напрыклад, заданні ЦТ).

Выбар факультатыва — права самога вучня. Бясспрэчна, ёсць нямала факультатыўных груп, дзе вучні выяўляюць высокую матывацыю да вывучэння прадмета, і ў такіх групах безадзнакавая дзейнасць настаўніка з'яўляецца арганічнай характарыстыкай адукацыйнага працэсу.

Разам з тым настаўнікі-практыкі часта адчуваюць і выказваюць насцярожанасць у адносінах да навучання без ацэньвання вучэбнай дзейнасці вучняў у балах, бо:

- па-першае, у факультатыўных групах могуць быць вучні, выбар якіх не быў цалкам самастойным (напрыклад, вырашылі ці паўплывалі бацькі);
- па-другое, вучні прызвычаіліся да знешняй бальнай ацэнкі іх працы і не адчуваюць стымулу да навучання. У хуткім часе такія вучні становяцца непаспяховымі і перастаюць наведваць заняткі, што часам прыводзіць да расфарміравання факультатыўнай групы.

Вынікае відавочная супярэчнасць: з аднаго боку, для забеспячэння матывацыі і актыўнасці вучняў не патрэбна знешняя ацэнка яго дзейнасці і індывідуальных вынікаў, а з другога боку — настаўнік пазбаўлены

важнага інструменту — уздзеяння і ўплыву на навучэнцаў праз адзнаку.

Гэта супярэчнасць вырашаецца досыць лёгка, калі прыняць тэзіс: з адыходам адзнак ацэньванне застаецца.

Аднак гэта пытанне, мяркую, недаскананала вывучана, бо ў час падрыхтоўкі і правядзення факультатыўных заняткаў узнікае нямала пытанняў наконт таго, якое ацэньванне прымяніць. Падказкі я знайшла ў публікацыі М. І. Запрудскага і Г. І. Дабрынеўскай «Арганізацыя факультатыўных заняткаў у 11-гадовай школе» і выкарыстоўваю наступныя формы:

1. Вуснае слоўнае ацэньванне («Малайчына! Ты добра засвоіў гэту тэму...»).

2. Самаацэнка і ўзаемаацэнка.

3. Ацэнка настаўніка, але толькі пасля сама- і ўзаемаацэнкі вучняў.

Прымяняю наступныя дыдактычныя сродкі, якія дапамагаюць навучэнцам убачыць свае прагалы ў ведах і адпрацаваць неабходны матэрыял:

**1. Карта ўліку ведаў**

| № п/п | Матэрыял | Ведаю | Сумняваюся | Патрэбна падрыхтоўка |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Знаходжанне назоўнікаў у сказе | | | |
| 2. | | | | |
| 3. | | | | |

**2. Ацэначны ліст**

| № п/п | Вучэбныя элементы | Не ведаю | Ведаю | Толькі разумею | Магу растлумачыць іншым |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Бяззлучнікавы складаны сказ | | | | |
| 2. | | | | | |
| 3. | | | | | |

Вывады:

**3. Розныя віды рэфлексіі** («Мішэнь», «Дрэва ведаў», «СМС настаўніку», «Прадоўжы сказ» і інш.)

Хачу падзяліцца **памяткай для вучняў** пры арганізацыі ўзаемаацэнкі:

1. Памятайце, што ацэньваецца работа, а не асоба.

2. Правільныя адказы адзначайце знакам «+», а няправільныя — «–».

3. Выкарыстоўвайце ўзор адказаў.

4. Калі вы сумняваецеся, папрасіце настаўніка дапамагчы.

Настаўніку вельмі важна развіваць у вучняў уменне ацэньваць працу аднакласнікаў, даваць каментарый і наладжваць зваротную сувязь.

На стадыі рэфлексіі выкарыстоўваю **прыём «Ацэначнае акно»**. Вучні самі адзначаюць у табліцы, якія веды па тэме заняткаў імі засвоены добра, якія не зусім зразумелі, што могуць прымяніць на практыцы, а што не.

У якасці другога варыянта можна выкарыстаць **прыём «Што мне неабходна»**:

- Мне неабходна вывучыць...
- Мне неабходна папрацаваць над...
- Мне неабходна паўтарыць...

Трэці варыянт — **ацэначны ліст «Ну і малайчына ж я!»**:

| Што мне неабходна ведаць | Ведаю добра | Папрашу растлумачыць яшчэ раз |
|---|---|---|
| 1. Якія сказы называюцца бяззлучнікавымі складанымі | | |
| 2. Сэнсавыя адносіны паміж простымі сказамі і бяззлучнікавымі складанымі сказамі | | |
| 3. Правілы пастаноўкі знакаў прыпынку | | |
| **Што мне неабходна ўмець** | | |
| 1. Адрозніваць бяззлучнікавыя складаныя сказы ад простых ускладненых і складаных злучнікавых сказаў | | |
| 2. Вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі бяззлучнікавых складаных сказаў | | |
| 3. Правільна ставіць знакі прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа | | |

Для ацэньвання вучнямі сваёй актыўнасці і якасці працы іншы раз прапаноўваю ім на лістках умоўна абазначыць свае адказы:

**V** — адказаў па просьбе настаўніка, але няправільна;

**W** — адказаў па просьбе настаўніка, адказ правільны;

**I** — адказаў па сваёй ініцыятыве, але няправільна;

**+** — адказаў па сваёй ініцыятыве, адказ правільны;

**0** — не адказаў.

У маіх вучняў стала папулярным пасланне СМС у канцы заняткаў. Прапаную ім на папяровых сотавых тэлефонах напісаць СМС-паведамленне сябру пра тое, як прайшлі заняткі, як вынікова ён папрацаваў.

Для таго каб скончыць заняткі на пазітыўнай ноце, можна выкарыстаць прыём рэфлексіі «Камплімент»: вучні ацэньваюць уклад кожнага ў заняткі і дзякуюць аднакласнікам і настаўніку за працу.

**III. Практычны этап.**

*Мэта этапу:* уключэнне настаўнікаў у працу па арганізацыі безадзнакавай дзейнасці вучняў на факультатыўных занятках.

Майстар. А цяпер пазнаёмімся з арганізацыяй безадзнакавай дзейнасці з дапамогай ацэначных лістоў і зваротнай сувяззю як сродкам самаацэнкі. Прапаную вам выступіць у ролі вучняў. На лістках пададзена заданне:

1. Пры падрыхтоўцы да заняткаў я стаўлю мэты:

а) для сябе;

б) для сябе і для вучняў;

в) для вучняў.

2. Пры падрыхтоўцы да заняткаў планую індывідуальныя заданні:

а) толькі для высокаматываваных вучняў;

б) толькі для слабапаспяваючых;

в) улічваю індывідуальныя здольнасці кожнага вучня.

3. Я ацэньваю вынікі вучэбнай дзейнасці школьнікаў:

а) на этапе актуалізацыі ведаў;

б) на асобных этапах заняткаў;

в) на ўсіх этапах заняткаў.

4. Безадзнакавае навучанне — гэта...

а) вынік працэсу ацэньвання, колькаснае выражэнне ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, абазначанае ў балах;

б) вызначэнне і выражэнне ацэнкі ва ўмоўных знаках, а таксама ацэначнае вызначэнне настаўнікам ступені засваення школьнікамі вучэбнага матэрыялу.

5. Да рэфлексійных метадаў безадзнакавай дзейнасці можна аднесці:

а) тэст, экспрэс-апытванне, пашыранае апытванне;

б) самаацэнку і ўзаемаацэнку.

6. Навучанне можа стаць безадзнакавым, калі яно будуецца па наступных правілах:

а) адзнака адсутнічае, але змястоўная ацэнка абавязкова;

б) вучні карыстаюцца арыенцірамі для самаацэнкі, якія для іх добра зразумелыя;

в) самаацэнка вучня папярэднічае ацэнцы настаўніка.

Майстар. Калі ласка, перавярніце ліст, на адваротным яго баку запісаны адказы. Параўнайце іх з вашымі адказамі. За правільны адказ пастаўце два «+» і падлічыце колькасць плюсоў.

Адказы: 1 — б; 2 — в; 3 — в; 4 — б; 5 — б; 6 — а, б, в.

Прапаную вам карткі з крытэрыямі, так зможаце вызначыць, наколькі вы ўмееце арганізаваць ацэначную дзейнасць на факультатыўных занятках.

**Крытэрыі ацэнкі**

А. 11—12 «+» — вы валодаеце дыдактычнымі сродкамі безадзнакавай дзейнасці вучняў на факультатыўных занятках на высокім практычным узроўні.

Б. 9—10 «+» — вы валодаеце дыдактычнымі сродкамі безадзнакавай дзейнасці вучняў на факультатыўных занятках, але яшчэ трэба папрацаваць над гэтым пытаннем.

В. 7—8 «+» і менш — вы ў недастатковай ступені валодаеце дыдактычнымі сродкамі безадзнакавай дзейнасці вучняў на факультатыўных занятках, і вам патрэбна дапамога.

Майстар. Напэўна, вы заўважылі, што ацаніць сябе без крытэрыяў ацэнкі вы не змаглі б.

Крытэрыі для самаацэнкі вучняў неабходна рыхтаваць да кожнага этапу факультатыўных заняткаў.

Спадзяюся, у вас склалася ўяўленне пра асаблівасці арганізацыі безадзнакавай дзейнасці навучэнцаў на факультатыўных занятках. Безумоўна, немагчыма выкарыстаць усе

прыёмы адразу, але сістэматычнае іх прымяненне зробіць працэс навучання больш цікавым і якасным.

Прапаную вам абмеркаваць у групах канкрэтныя прыклады ацэньвання вучэбнай дзейнасці вучняў на факультатыўных занятках і абгрунтаваць свой выбар у вусным выступленні.

*(Выступленні прадстаўнікоў груп.)*

**IV. Рэфлексійны этап.**

*Мэта этапу:* вызначэнне важнасці праведзеных заняткаў.

Майстар. На думку французскага празаіка і драматурга Эрнэста Легуве, задача педагогаў — «навучыць нашых дзяцей абыходзіцца без нас», гэта значыць навучыць усяму таму, што ўмеем мы самі, і нават больш.

Адукацыя — інвестыцыя ў сябе. Давайце будзем помніць пра гэта і будаваць працэс навучання так, каб інвестыцыі вучняў у саміх сябе былі паспяховымі і значнымі.

Для вызначэння важнасці праведзеных заняткаў у рамках майстар-класа прапаную прыём «Плюс-мінус-цікава» па табліцы брытанскага псіхолага Эдварда дэ Бона.

**Прыём «Плюс-мінус-цікава»**

| Плюс | Мінус | Цікава |
|---|---|---|
| Запісаць тое, што спадабалася на майстар-класе (інфармацыя, форма і інш.), выклікала станоўчыя эмоцыі | Запісаць тое, што не спадабалася на майстар-класе, здалося сумным, незразумелым, непатрэбным | Пазначыць факты, пра якія даведаліся на майстар-класе, пажаданне наконт таго, пра што яшчэ хацелася б даведацца па дадзенай праблеме |
| | | |

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

*Валочка, Г.* Арганізацыя і правядзенне факультатыўных заняткаў па беларускай мове / Г. Валочка // Роднае слова. — 2010. — № 7. — С. 71.

*Дудинская, Л. В.* Контроль и оценка учебной деятельности школьников / Л. В. Дудинская // Нар. асвета. — 2002. — № 9. — С. 63—65.

*Запрудский, Н. И.* Контрольно-оценочная деятельность учителя и учащихся : пособие для учителя / Н. И. Запрудский. — Минск : Сэр-Вит, 2012. — 160 с.

*Запрудский, Н. И.* Организация факультативных занятий в 11-летней школе / Н. И. Запрудский, А. И. Добриневская. — Минск : Зорны верасень, 2008. — 164 с.

## Да ведама аўтараў і чытачоў

Рэдакцыя прымае да разгляду матэрыялы на беларускай мове аб'ёмам да 20 машынапісных старонак (можна дасылаць электроннай поштай).

Неабходна ўказаць прозвішча, імя і імя па бацьку аўтара, месца яго працы, займаемую пасаду, кваліфікацыйную катэгорыю, вучоную ступень, вучонае званне, хатні адрас, кантактныя тэлефоны, грамадзянства, пашпартныя звесткі (серыя, нумар пашпарта, калі і кім выдадзены, асабісты нумар, адрас рэгістрацыі). Без гэтых звестак матэрыялы не разглядаюцца.

Дасылаючы ў часопіс распрацоўкі ўрокаў, абавязкова пазначайце клас, чвэрць і месяц, калі тэма вывучаецца ў школе.

Рукапісы аўтарам не вяртаюцца.

Падпісацца на часопіс «Беларуская мова і літаратура» можна ў аддзяленнях РУП «Белпошта» паводле Каталога падпісных выданняў Рэспублікі Беларусь і ў кіёсках «Белсаюздрук».

Звяртаем увагу на **індэксы і кошт часопіса** ў другім паўгоддзі 2020 г.:

**75063** — для індывідуальных падпісчыкаў (кошт часопіса: **«Белпошта» — 8,13 руб.; «Белсаюздрук» — 7,57 руб.**); **750632** — для арганізацый (кошт часопіса: **«Белпошта» — 10,88 руб.; «Белсаюздрук» — 10,38 руб.**).

Дасылаючы матэрыял у часопіс, можна заказаць неабходную колькасць экзэмпляраў з вашым артыкулам у выдавецтве «Адукацыя і выхаванне» па тэл. 297-93-25 (аддзел продажу).